НАЙЛЕПШАЯ ШМАТДЗЕТНАЯ СЯМ'Я

ЯК СТАЛЕЛІ Ў АМЕРЫКАНСКІХ 90-Х 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 САКАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 53 (28920)

ЛІЧБА ДНЯ

36,5 %

уведзенага ў студзені — лютым жылля ў краіне пабудавана для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. У студзені — лютым арганізацыі ўсіх формаў уласнасці пабудавалі 4,2 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 480,4 тысячы кв. м агульнай плошчы жылля. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 175,3 тысячы кв. м агульнай плошчы, або 36,5 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 176,2 тысячы кв. м агульнай плошчы жылля, або 36,7 % ад агульнага ўводу па краіне.

КОРАТКА

- **Экспазіцыя да 75-годдзя вызвалення Азарыцкіх лагераў смерці адкрылася ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**
- Саўмін прызначыў прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання буйнымі ААТ.
- **У Турцыі адкрылі самы вялікі ў Еўропе парк забаў.**

- Рыбакоў, якія добраахвотна здадуць сеткі, вызваляць ад адказнасці.
- **Мінскі метрапалітэн восенню плануе пачаць эксплуатацыю цягніка «Штадлер» .**

ISSN 1990 - 763X

ЗАХАВАЛЬНІКІ РОДНЫХ ВЫТОКАЎ

Каля вёскі Прасалы Шклоўскага раёна, на беразе невялікай рачулкі, дзе здавён бяжыць крынічны струменьчык гаючай вады, з мінулай восені працягваецца творчая, не пабаюся сказаць, эксклюзіўная будоўля. У чым яе сутнасць, арыгінальнасць і незвычайнасць, няцяжка здагадацца. Задума простая — культаралагічны, экалагічны і гістарычны «народны» праект пад назвай «Родная крынічка». Пачынаўся ён звычайна: аднойчы былыя аднавяскоўцы і сябрукі сустрэліся і вырашылі, што ў Год малой радзімы яны зробяць для роднай вёскі падарунак — навядуць адмысловы парадак на мясцовай крыніцы.

Калі мне давялося апынуцца на месцы будоўлі, каля крыніцы працавалі два майстры — вядомы на Магілёўшчыне разьбяр па дрэве Пятро ПЕЧАНЬКОЎ і цяперашні жыхар Шклова, чаканшчык па метале, сталяр і разьбяр Мікалай ПУНЧАНКА. Цікава, што яны абодва закаханыя і ў паэтычную музу — ствараюць вершы і песні.

— У нашай творчай брыгадзе працуюць і іншыя людзі — гэта Аляксандр Ромскі і Леанід Сімановіч, — кажуць Пятро і Мікалай пра сваіх аднавяскоўцаў. А яшчэ расказваюць і пра былога захавальніка крыніцы Рыгора Аладзьева. Менавіта яго — ветэрана вайны, першага паслявaеннага рупліўца вясковай крынічкі, Пятро Печанькоў «увекавечыў» у дрэве, а скульптуру паставілі на ўваходзе ў комплекс — каб усе ведалі, хто такі дзядзька Рыгор.

Сваімі сіламі, на ўласныя грошы, майстры аднаўляюць старажытную крыніцу. Не засталіся без дабрадзейнага ўдзелу і жыхары суседніх вёсак Карзуны, Слабодка, Стараселле, Вышкава, на іх грошы набывалі будаўнічыя матэрыялы. Майстры паспелі ўжо вылажыць нішу для сцёку вады, зрабіць дах над крыніцай, узвесці ўваходнюю браму. Да лета крыніца будзе цалкам уведзена ў строй.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Рэха вайны

«Дзеці ў пясочніцах на касцях гуляць не будуць»

У Брэсце працягваюцца раскопкі на месцы былога гета. Падняты астанкі амаль тысячы чалавек

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Аляксандр РАГАЧУК паказвае старыя будынкі «Прыбужскага квартала».

У самым цэнтры Брэста, куды прыйшоў інвестар, каб распачаць будаўніцтва квартала сучаснай жылой забудовы, працягваюцца раскопкі. Па стане на мінулы тыдзень ужо паднялі астанкі 990 чалавек. Раскопкі працягваюцца. Не выключаецца, што будзе выяўлена яшчэ адна вялікая магіла. Можа, так лёсу было заўгодна, каб напярэдадні вялікіх юбілейных святкаванняў усё гэта выявілася і рэшткі людзей нарэшце былі пахаваныя па-чалавечы...

СТАР. 13

Камунальныя стасункі

Цэтлікавы дзёгаць у пластыкавым мёдзе,

або Новыя жыцці палімераў і пластмасавая культура як паратунак ад смецця

Лаўкі, плітка для тратуара, плёнка на цяпліцу, вёдры, смеццевыя кантэйнеры... Усё гэта ў Беларусі вырабляецца з выкарыстаннем перапрацаваных палімераў. Аднак падарыць другое жыццё ўсім выкінутым у смецце пластыкавым рэчам, на жаль, немагчыма, бо шмат якія з іх не паддаюцца другаснай апрацоўцы і едуць на звалкі. Замест пошукаў новых шляхоў пазбаўлення ад смецця лепш памяншаць утварэнне адходаў, якія нельга выкарыстаць ізноў, лічаць спецыялісты і раяць, як гэта рабіць.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

СТАР. 4